# СТЫЛІСТЫЧНЫЯ РЭСУРСЫ ЭПІФАРЫ Ў ПАЭТЫЧНАЙ МОВЕ

**А.Р. Рыбакова**

З часоў антычнасці ўвагу лінгвістаў прыцягвае феномен паэтычнага тэксту – гарманічнае спалучэнне выразнай і арнаментальнай функцый мастацкага слова.

У акце мастацкай камунікацыі з мэтай узмацнення выразнасці вершаванай мовы выкарыстоўваецца вялікі арсенал сродкаў і прыемаў. Асаблівую цікавасць у гэтым плане ўяўляе так званая ўпарадкаванасць па эквівалентнасці, якая рэгулюе «адносіны паміж аднолькавымі моўнымі элементамі па - за адносінамі да сінтагматыкі тэксту» [1] і выражаецца з дапамогай розных відаў паўтору.

Асноўная ўмова рэалізацыі паўтору ў выяўленчай функцыі – шчыльнасць шэрагу адзінак, якія паўтараюцца ў маўленчым ланцужку [2].

Паўтор як выяўленчы сродак шырока выкарыстоўваецца ў стылістычных фігурах дабаўлення (анафары, эпіфары, гемінацыі, і г.д.).

Выразнасць, асаблівая рытміка – інтанацыйная структура як асноўны арганізуючы пачатак паэтычнага маўлення непасрэдным чынам адлюстроўваецца ў экспрэсіўных магчымасцях аднаго з відаў упарадкаванага дыстнатнага паўтору – эпіфары.

Эпіфара (грэч. epiphora з epi – пасля + phoros – нясучы) – стылістычная фігура, якая заключаецца ў паўторы адных і тых жа элементаў у канцы кожнага паралельнага раду (верша, страфы, сказа і г.д.) [3].

Эпіфару можна назваць «адваротнай анафарай», бо яна ўяўляе сабой той жа тып лакалізаванага паўтору, аднак «перакінутага» ў канцы сумежных сказаў:

Чалавек у цэлі сядзеў пад зямлей,
Трэці год у цэлі сядзеў пад зямлей,
Пажыццева ў цэлі сядзеў пад зямлей [4]
Быў бліжэй за ўсіх густа – сіні мыс,
А далей, за ім, быў блакітны мыс,
А за ім – туманна-жамчужны мыс. (С. 196)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Выяўленчая сіла эпіфары запраграмавана яе катэгарыяльнымі уласцівасцямі, - і перш за ўсе, канатацыяй, якая ствараецца шматкампанентнай асновай, багатым падтэкстам:

Ды зірні і ўважай :
над Масісам крывавы ятаган,
Над Масісам месяц – крывавы ятаган (С.386)
Белыя прывіды дрэў у тумане,
Вочы кахання, голас кахання,
Вусны кахання. (С. 379)
Белыя вішні ў туман адыходзяць,
У ноч адыходзяць,
У сон адыходзяць,
Ціха ў любоў адыходзяць. (С. 379)

Эпіфара можа структурыраваць вершаваны тэкст любога памеру, выконваючы пры гэтым важную сэнсавую задачу. Кампазіцыйна удалым з'яўляецца выкарыстанне эпіфары ў многіх вершах У. Караткевіча («З зорнага сяйва і пены крывавай, або Паэма аб павароце стырна», малая паэма «Гулянка ў дэкарацыях», «Усходнія песні» і г. д.):

Судна шчасна плыло дарогай марской,
Дарогай краін і вякоў
Да пуцяводнай зоркі сваёй,
Да летуценнай зоркі сваёй,
Да адзінай на свеце зоркі сваёй –
Імя каторай – любоў (С. 357)

Выконваючы рытарычную функцыю, эпіфара з'яўляецца семантычна напоўненай:

І сіл няма, і вояў няма,
І здрадзіла панства, Марыся (С. 258)
І свет – не пустка мне з табой,
І бог – не пастка мне з табой (С. 274)
І няхай на хвіліну здаецца мне,
Што кахаю, кахаю,
Безнадзейна кахаю,
Па вар'яцку
Шалёна
Кахаю
Цябе. (С.176)

Выводзячы пэўныя структурныя элементы тэксту (слова, словазлучэнне, сказ) са стану моўнай аўтаматызацыі, эпіфара канцэнтруе на іх увагу, а гэта значыць, садзейнічае іх семантызацыі. Як правіла, эпіфарычныя паўторы надаюць выказванню песімістычную, часам адмоўную афарбоўку. З дапамогай эпіфары падкрэсліваецца стабільнасць, бясспрэчнасць канчатковага выніку.

Як бачым, узмоцненая выяўленчая роля эпіфары як стылістычнай фігуры звязана з асаблівым сэнсава- выдзяляльным значэннем, якое спрыяе насычанасці, павышанай інфарматыўнасці, акрэсленай выразнасці паэтычнага радка.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Літаратура:

1. Лотман. Ю. М. Структура художественного текста. – М., 1970, – С.132
2. Хазагеров Т. Г.. Ширина Л. С. Общая риторика. Курс лекций. – Ростов-на-Дону, 1999, – С. 260
3. Розенталь Д. Э., Теленкова М. А. Словарь – справочник лингвистических терминов. – М., 1976. – С.320.
4. Караткевіч У. Збор твораў: у 8 т. – Мн., 1987. – т. 1. – С.300. Далей спасылкі на гэта выданне будуць пададзены ў тэксце з указаннем старонкі.